| ***Этапы ўрока*** | ***Плануемы вынік*** | ***Задачы настаўніка*** | ***Дзейнасць настаўніка*** | ***Дзейнасць вучняў*** | ***Сродкі, формы*** |
|---|---|---|---|---|---|
| *Арыенціровачна-матывацыйны этап* | | | | | |
| Арганізацыйны | Добразычлівы, псіхалагічны настрой вучняў і настаўніка на супрацоўніцтва | Псіхалагічна падрыхтаваць вучняў да ўрока, настроіць на супрацоўніцтва | Вітаецца з вучнямі, арганізуе іх увагу, псіхалагічна настройвае на супрацоўніцтва | Арганізоўваюцца, псіхалагічна настройваюцца на працу | Праца ў парах, гутарка |
| Актуалізацыя вопыту вучняў Матывацыя | Актывізацыя суб’ектыўнага вопыту вучняў, развіццё пазнавальнага інтарэсу, матывацыі | Актуалізаваць апорныя веды і ўменні, сфарміраваць пазнавальныя матывы | Задае пытанні, якія дапамагаюць актуалізаваць асабісты вопыт вучняў | Адказваюць на пытанні настаўніка | Франтальная |
| Мэтавызначэнне | Фармуляванне тэмы, вызначэнне мэтаў урока. Усведамленне і разуменне | Стварыць умовы для самавызначэння вучняў на дзейнасць і яе | Аб’яўляе тэму заняткаў і прапануе вучням сфармуляваць мэту іх дзейнасці на | Кожны вучань занатоўвае ў апорны канспект **(Дадатак1)** свае мэты на ўрок. У парах абмяркоўваюць пытанні, | Індывідуальная, парная |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | асобаснага сэнсу вывучаемай тэмы | выніκі | ўроку | якія ўзніклі | |
| *Аперацыйна-пазнавальны этап* | | | | | |
| Паглыбленне і сістэматызацыя ведаў | Прэзентацыя праекта. Паглыбленне вучнямі ведаў і ўменняў правільна пісаць словы з вялікай і малой літар; уменне аргументаваць выбар арфаграмы | Арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў, іх трэніроўку ў тых дзеяннях, авалоданне якімі з’яўляецца мэтай урока. | Стымулюе вучняў да творчай і пазнавальнай актыўнасці, стварае ўмовы для прымянення атрыманых ведаў у розных вучэбных сітуацыях | Першая група прадстаўляе праект “Славутыя імёны” **(Дадатак 2)** (на прыкладзе славутых імён тлумачаць правапіс вялікай і малой літары ў імёнах, прозвішчах, псеўданімах і г.д.). Астатнія вучні ўспрымаюць інфармацыю, актуалізуюць і паглыбляюць веды. | Індывідуальная, франтальная |
| | Праверка ступені засваення, карэкцыя ведаў | Забяспечыць своечасовае выяўленне прабелаў у ведах вучняў і іх карэкцыю | Стварае ўмовы для эфектыўнай пазнавальнай дзейнасці. Пры неабходнасці адказвае на пытанні | Прадстаўнікі групы зачытваюць пытанні віктарыны. У ходзе віктарыны “Хто гэта?” запісваюць імёны знакамітых беларусаў. | Індывідуальная, франтальная |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Правяраюць сябе па прапанаваным ключы, пры неабходнасці задаюць пытанні вучням, якія рыхтавалі віктарыну, або настаўніку па персаналіях і напісанні | |
| | Выпрацоўка практычных навыкаў | Стварыць умовы для засваення вучнямі ведаў у форме дзейнасці, развіцця спосабаў мыслядзейнасці | Прапануе вучням дапісаць азначэнні – характарыстыкі да запісаных імі выбітных асоб Беларусі **(Дадатак4)** | Вучні суадносяць характарыстыку з прапанаванымі асобамі, запісваюць іх, каменціруючы выбар напісання вялікай ці малой літары | Індывідуальная, франтальная |
| Фізкультхвілінка | Зняцце статычнага напружання, пераключэнне ўвагі | Забяспечыць захаванне здароўя вучняў, падтрымаць іх пазнавальную актыўнасць і | Прапануе вучням сабрацца ў групы ў адпаведнасці з тым, якая кветачка ў каго размешчана на апорным канспекце, | Збіраюцца ў групы, прымацоўваюць рэпрадукцыі карцін, выявы архітэктурных помнікаў і назваў літаратурных твораў. Адказваюць на пытанні | Групавая |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | працаздольнасць | размясціць рэпрадукцыі карцін, назвы твораў і выявы архітэктурных помнікаў **(Дадатак6)** на адпаведных дошках, абмеркаваць правапіс вывучаных арфаграм, успомніць віды мастацтва, звярнуць увагу на творы юбіляра У.Караткевіча. Звяртае ўвагу на выяву Будслаўскага касцёла, у якім знаходзіцца ікона Божай Маці. | настаўніка | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Тлумачыць напісанне слоў, якія абазначаюць назвы бостваў і хрысціянскіх святынь.<br>Задае групам пытанні **(Дадатак 4)** | | |
| | Прэзентацыя праекта. Паглыбленне вучнямі ведаў і ўменняў правільна пісаць словы з вялікай і малой літар; умення аргументаваць выбар арфаграмы | Арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў, іх трэніроўку ў тых дзеяннях, авалоданне якімі з'яўляецца мэтай урока | Стымулюе вучняў да творчай і пазнавальнай актыўнасці, стварае ўмовы для прымянення атрыманых ведаў у розных вучэбных сітуацыях | Другая група прадстаўляе свой праект "Мая Радзіма – Беларусь" **(Дадатак 3)** , які сістэматызуе веды вучняў пра напісанне геаграфічных і астранамічных назваў, населеных пунктаў | Індывідуальная, групавая, франтальная |
| | Праверка ступені засваення, | Забяспечыць своечасовае | Стварае ўмовы для эфектыўнай | Прадстаўнікі II групы, якія рыхтавалі праект, | Індывідуальна, франтальна |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | карэкцыя ведаў | выяўленне прабелаў у ведах вучняў і іх карэкцыю | пазнавальнай дзейнасці. Пры неабходнасці адказвае на пытанні | зачытваюць пытанні бліц-турніру “А ці ведаеце вы?”. Вучні адказваюць на пытанні і запаўняюць карткі з адказамі, арганізуюць праверку | |
| | Выпрацоўка практычных навыкаў | Стварыць умовы для засваення вучнямі ведаў у форме дзейнасці, развіцця спосабаў мыслядзейнасці | Прапануе вучням дыктант з працягам краязнаўчага характару, просіць дапісаць назоўнікі, каб адносныя прыметнікі з суфіксам -ск- пісаліся з вялікай і малой літары. Арганізуе самастойную работу ў групах і яе праверку | Вучні дапісваюць прапушчаныя словы, устаўляюць прапушчаныя літары, тлумачаць выбар арфаграмы; называюць запісаныя словазлучэнні. У парах, а затым у групах вызначаюць, якія архітэктурныя помнікі і духоўныя святыні ім прапанаваны **(Дадатак 5)**, запісваюць іх назвы, суадносяць дзяржаўныя святы і даты, у якіх усе | Індывідуальная, парная, групавая, франтальная |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | **(Дадатак 4)** | словы пішуцца з вялікай літары (пр.108) | |
| *Кантрольна-карэкцыйны этап* | | | | | |
| Кантроль, самакантроль, карэкцыя ведаў | Выкананне тэставых заданняў, рух да новага ўзроўню засваення ведаў, выпраўленне памылак, асэнсаванне вучнямі ўласнага ўзроўню засваення і вынікаў работы | Ажыццявіць кантроль і карэкцыю, арганізаваць самакантроль і самаацэнку вучнямі ўзроўню засваенню ведаў, у развіцці ўменняў, паспяховасці сваёй дзейнасці | Актывізуе мысліцельную дзейнасць, прапануе тэставыя заданні (выхадны кантроль), арганізуе самакантроль і самаацэнку дзейнасці вучняў, арганізуе дзейнасць вучняў па выяўленні прабелаў у ведах | Выконваюць тэст на праверку ўзроўню засваення праграмнага матэрыялу **(Дадатак 1),** ажыццяўляюць самакантроль, выяўляюць праблемы, аналізуюць прычыны і шляхі іх пераадолення | Індывідуальная, франтальная |
| Рэфлексія | Самаацэнка, асэнсаванне значнасці вучэбнай дзейнасці | Стварыць умовы для асэнсавання эфектыўнасці пазнававальнай | Арганізуе дзейнасць вучняў па асэнсаванні вучнямі паспяховасці | Асэнсоўваюць значымасць для сябе атрыманых ведаў, выдзяляюць цяжкасці, ацэньваюць уласную | Франтальная |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | дзейнасці вучняў і асобасных сэнсаў у вывучэнні тэмы | выканання задач урока, атрымлівае інфармацыю пра самаацэнку вучняў, выяўляе праблемныя зоны для наступнай карэкцыі, падводзіць вынікі ўрока | дзейнасць | |
| Падвядзенне вынікаў заняткаў. Кантрольна-ацэначная дзейнасць | Якасная характарыстыка работы класа, зварот да мэтаў урока, суаднясенне вынікаў урока з запланаваным | Садзейнічаць фарміраванню адэкватнай самаацэнкі вучняў | Аналізуе вынікі работы, ацэньвае вучняў, якія рыхтавалі праекты | Асэнсаванне інфармацыі | Франтальная |
| Інфармацыя пра дамашняе заданне | Асэнсаваны выбар прымянення ведаў | Забяспечыць разуменне вучнямі мэтаў, | Паведамляе пра дамашняе заданне, каменціруе яго | Асэнсоўваюць змест задання, занатоўваюць у дзённікі | Франтальная |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | зместу выканання дамашняга задання. | змест, спосабы яго выканання | | |